# З палескіх крыніц

(Беларускія казкі)

Брэст
МП «Брэстдрук»
1992 г.

Гэтую кніжку складаюць казкі, запісаныя ад «непісьменных пісьменнікаў» — казачнікаў Рэдкага, Д, Куляша, М, Бахмачыхі, Д. Рачынскага ў розных кутках Палесся. У асноўным іх сабраў А. К. Сержпутоўскі, які жыў і працаваў на Берасцейшчыне. У некаторых тэкстах дапушчаны нязначныя скарачэнні.

**Беларусь, асабліва Палессе, унікальны куток на карце Еўропы, дзе яшчэ ў кэнцы мінулага і на пачатку нашага стагоддзя пышна цвілі і плённа радзілі сады вуснай народнай творчасці.**

У. А. КАЛЕСНІК. Тварэнне легенды, Мінск. 1987,

## СТАРЫ БАЦЬКА

Кажуць: што край, то звычай, што сяло, то нораў, а што галава, то розум. У адным месцы быў звычай дабіваць старых людзей, каб яны дарэмна не елі хлеба, калі не могуць працаваць. Часам і самі старыя людзі прасіліся, каб іх дабілі, бо, ведама, ім цяжка было лупаць вачыма, чакаць, пакуль ім дадуць есці або піць. От жыў адзін чалавек; у яго многа было дзяцей, ды ўсе ўдалыя, добрыя. Зусім састарэўся бацька, а яны яго слухаюць, шануюць. Але от давай суседзі прыстазаць, каб яны дабілі свайго бацьку-дармаеда, бо ён ужо вельмі стары і ні да чаго не гожы. Шкада дзецям старэнькага бацькі. І схавалі яны яго ў пограб ды носяць яму туды цішком есці і піць.

Доўга жыў старэнькі ў пограбе. Ляжыць сабе на саломцы, а як суседзі разыдуцца на работу, дык ён высунецца з пограба, паглядзіць на яснае сонейка, пагрэецца і зноў схаваецца ў пограб. Малыя ўнукі і праўнукі прыносяць яму туды суніц або іншых ягад, і ён есць і кажа ім казкі. А то забягуць да яго маладзіцы або дзяўчаты, пяюць яму ў пограбе песні, чэшуць галаву. А сыны, ужо барадатыя, часта прыходзяць да старэнькага бацькі пажупіць пра гаспадарку ды папытаць у старога, калі і дзе што сеяць, як лепш абрабляць поле, як даглядаць гавядка. Старэнькі ўсё ім скажа, усяму навучыць, Жыве сабе стары бацька, а дзеці і ўнукі рады. Але вось настаў там вялікі голад. Прапаў амаль увесь статак. Пухнуць людзі ад голаду, жыватамі качаюцца, — няма за што рук залажыць. Панеслі дзеці старэнькаму бацьку апошні хлеб, а ён дый кажа ім, каб яны садралі з хат стрэхі ды і вымалацілі тую салому. Паслухалі дзеці старэнькага бацьку, садралі стрэхі ды і давай малаціць старую салому. Глядзяць — аж на таку так многа зярнят, што хваціць хлеба да новага ўраджаю. Пытаюць суседзі, адкуль у іх хлеб, а тыя і расказалі ім, што гэта навучыў іх стары бацька, якога яны хаваюць у пограбе. Пайшлі ўсе суседзі, старыя і малыя, у пограб к старэнькаму ды і вынеслі яго адтуль на руках. Доўга яшчэ пасля таго жыў старэнькі бацька. Вось з той пары перасталі дабіваць старых людзей, а пачалі ім служыць, даглядаць іх ды шанаваць.

## АСІЛАК

Жылі сабе дзед ды баба. Жылі яны ў згодзе: любіліся-кахаліся ўсё жыццё, разам гаравалі, разам працавалі. І былі шчаслівыя, толькі ў адным не было ім уцехі — пражылі ўвесь век і не мелі дзяцей.

— Хто нам на старасці вады падасць? — часта гаварыла баба і фартухом уцірала слёзы.

— Не плач, баба, — развлажаў яе дзед, — мо яшчэ і парадуемся на старасці.

Бабка пакідала плакаць і ціхенька смяялася. Бывала, яе вочкі блішчаць ад радасці, дарма, што твар, бы ралля, увесь зморшчыўся. Ведама, чалавек ніколі не кідае надзеі на шчасце, бо без надзеі нельга жыць на свеце. Часта маладзіцы прасілі бабу, каб яна бабіла ў іх дзяцей. Але баба ўсё адпіралася, бо, ведама, яна баялася, што як родзіцца ў яе дзіця, то яго будуць зваць бабічам ды пасміхацца.

Вось раз дзед быў на гумне, а баба ўхаджалася каля печы, пякла аладкі. Толькі вось клубок агню ўскочыў праз акно і качаецца па хаце. Спалохалася баба, не ведае, што рабіць. Млосць узяла бабу. Дацяглася яна да полу дый прылегла. Ці доўга, ці мала яна ляжала, толькі вось ачухалася трохі дый дзізіцца, што б гэта было.

Толькі вось зажадалася бабе, як жывое вады, то асяленца, то тарана, то воцату. Заганяла яна дзеда, каб ён даставаў ей усё, чаго яна пражэцца. Пачала баба гаварыць маладзіцам, чаго ёй жадаецца, а тыя і кажуць, што гэта на маладое. Пасміхаюцца маладзіцы са старое бабы, а яна ўсё не верыць. Але вось і нарадзіўся ў яе такі гожы хлапчук, што ўсе і надзівіцца не могуць. Расце хлапчук ды сілы набіраецца. І скора ён стаў такі дужы, што яго ні адзін самы здаравенны мужчына не можа пабароць. Вырас асілак, увабраўся ў сілу і давай ён збірацца ў свет. Як ні ўпрошвалі дзед з бабаю, каб ён не пакідаў іх на старасці, — куды там!

— Няма чаго мне тут з вамі сядзець ды курэй заганяць. Я пайду шукаць ворагаў і ці сам загіну, ці ворагаў загублю.

Няма чаго рабіць — прыбралі дзед з бабаю свайго сынка ў вялікую дарогу і з плачам правялі яго за сяло. Тут яны развіталіся і вярнуліся да гасподы, бо далей не маглі ісці — вельмі ўжо былі старэнькія.

Увайшоў Асілак — так яго ўсе называлі — у цёмны лес ды так засвістаў, што аж лісце пасыпалася. Спалохаліся птушкі, пахаваліся ў галлё. Спалохаліся дзікія звяры, пахаваліся, хто куды мог.

Жылі ў гэтым лесе сем братоў, сем разбойнікаў. І ніхто не смеў прайсці або праехаць праз той лес. Жылі яны там і нікога не баяліся.

Пачулі разбойнікі той свіст і пайшлі проста на Асілка. Тым часам Асілак выйшаў на прасельку, наклаў агню, сядзіць сабе ды на ражончыку пячэ сала. Тут яго разбойнікі і абступілі адусюль.

—Якія вы людзі і што вам трэба? — пытае Асілак.

— Хто ты такі, што пасмеў прыйсці ў наш лес? — пытае старшы разбойнік.

— Хто я — пазнаеш, як памераешся са мною сілаю, а лес не твой. Лес на патрэбу ўсім людзям расце,

— Гэта наш лес, гэта наша панства. Мы тут тубальцы з даўніх часоў.

—Вы разбойнікі. Вы разбоем запанавалі гэтым лесам. А я прыйшоў, каб адабраць у вас пушчу і даць усім людзям.

—Гэ, які ты моцны! Давай перш паборамся, хто з нас дужэйшы.

—Давай.

Узяў старшы разбойнік жалезную булаву ў дзесяць пудоў і стаў перад Асілкам. Асілак азірнуўся кругом, бачыць — непадалёчку стаіць вялізарны дуб, што ўтрох не абняць. Ухваціў гэта Асілак той дуб дый вырваў з карэннем. Убачылі тое разбойнікі, спалохаліся і давай прасіцца, каб ён не губіў іх.

— Будзь у нас старшым, і тады мы ўсім светам запануем.

— Не, — кажа Асілак, — не затым я прыйшоў, каб светам панаваць, а затым, каб аслабаніць свет ад паноў, бо ўсялякі чалавек сам сабе пан. А хто хоча быць панам над другімі людзьмі, той вораг.

І давай тыя сем братоў, сем разбойнікаў прасіцца, каб Асілак узяў іх к сабе ў таварышы.

—Добра, — кажа Асілак.

І пайшлі яны разам. Ідуць яны сабе ды ідуць ад аднаго сяла да другога. І ўсюды Асілак усё адно кажа, што ўсе людзі самі сабе паны. У яго прымаўка была: «Еш хлеб і людзям дай» і «Жыві, спажывай, ды людзей не ўжывай». Ведама, хто любіць кусацца, таго і другія кусаюць.

І пачаў Асілак навучаць, каб людзі жылі ў згодзе і ласцы.

— Тады, — кажа, — ніякае ліха з ім не справіцца, бо згодная грамада, бы адзін вялікі чалавек, вялікі багатыр, дужэй за ўсіх багатыроў.

Пайшла тая прачутка па ўсім свеце. Спужаліся паны і давай лавіць Асілка. Доўга яны шукалі яго ды ўсё не маглі знайсці. Але вось тыя сем братоў, сем разбойнікаў захацелі самі быць панамі, згаварыліся і выдалі Асілка. Паны рады, называюць разбойнікаў сваімі братамі, чапкуюць перад імі і даюць ім маёнткі, многа грошай і ўсяля-

кага дабра. Давай гэта разбойнікі падгаворваць людзей. Адных падгаварылі, другіх застрашылі, а трэціх падпаілі. Ведама, заўжды многа знойдзецца дурных людзей, што яны гатовы самі ў вяроўку лезці. Яны і сказалі панам, дзе жыве Асілак.

Набралі паны салдат і напалі на Асілка. Асілак тым часам нічога не зедаў і лёг на спачынак. Тут салдаты напалі на яго, звязалі вяроўкамі і вядуць к панам. Сабралася многа людзей. Шкада ім Асілка, ды няма чаго рабіць. Не могуць адабраць у салдат добрага чалавека. Вядуць салдаты Асілка ў двор, а людзі цягнуцца ззаду. Мужыкі маўчаць, апусціўшы галовы, а бабы плачуць ды божкаюць: «На каго ж ты нас пакідаеш? Хто ж нам скажа добрае слоўца?».

Тым часам сабралася паноў, што хоць гаць гаці ды па галавах хадзі. Бы ваўкі над падлай завылі, што Асілка злавілі. Смяюцца, рукі паціраюць ды якую прыдумаць кару выбіраюць. Адзін кажа — шкуру з жывога садраць; другі кажа — ганталёў у цела пазаганяць; трэці кажа — павесіць за язык, каб увесь свет знаў, што пан — то не мужык; чацвёрты кажа — язык адрэзаць ды ногі перабіць, каб не мог па свеце хадзіць, не мог гаварыць ды людзей вучыць.

Пакуль яны крычалі ды кару прыдумлялі, Асілак страпянуўся, вяроўкі парваў і да людзей сказаў:

— Браткі, калі б паноў чорт узяў, то б свет бяды не меў, а без гарапашнікаў мужыкоў не было б ні хлеба, ні асьмакоў. А каб гэта ліха зламаць, трэба ўсім як адзін чалавек стаць, не грызціся паміж сабою ды ад ворагаў бараніцца гурбою.

Так сказаў асілак і знік, толькі клубок агню з таго месца пакаціўся па зямлі. Спалохаліся паны, стаяць ды дрыжаць, Ачухаліся яны, азіраюцца, бы ваўкі ў ваўкаўні. А Асілак, кажуць, і да гэтых часоў па свеце гуляе ды людзей навучае.

## АГОНЬ У СЭРЦЫ, А РОЗУМ У ГАЛАВЕ

Даўно тое было. Жыў сабе адзін чалавек. Быў ён вельмі цікавы. І хацеў усё знаць. Куды ні гляне, што ні ўбачыць, то ўсё пытае: што гэта такое, чаму яно ды навошта? Казалі яму, казалі людзі, нарэшце ўбачылі, што і самі не знаюць, дый кажуць яму:

—Дзівачны ты чалавек, колькі не пытай, то дурнем памрэш, бо ўсяго не пазнаеш.

Не слухаў ён людзей, кінуў гаспадарку і пайшоў у свет.

—Пайду, — кажа, — к яснаму сонейку, яно ўсюды свеціць, усё бачыць, дык усё знае. Запытаю ў яго, чаму так робіцца на свеце.

Вось ідзе ён ды ідзе, бачыць, — сядзіць каля дарогі на камяні чалавек ды ўсё крычыць, пытае:

— Дакуль я буду сядзець?

І просіць ён, каб запытаў у сонейка, калі ён устане. Пайшоў далей дый бачыць, што якісь чалавек падпірае тын. Зірнуў ён, але не ведае, што гэта той робіць. Ідзе ён далей, аж дзве жанчыны пераліваюць у рацэ ваду. Зацікавіўся, але не ведае, што гэта яны робяць, і пайшоў далей. Мо ўжо зусім блізка падышоў ён к сонейку, дзе яно з-за зямлі ўсходзіць на небе, і бачыць, што чалавек праграбае смецце. Пайшоў ён далей ды як зірнуў праз лес, дык аж вочы зажмурыў, такі там бляск. Падышоў ён бліжэй, аж гэта палацы сонейка блішчаць у золаце, бы агонь гарыць. Насілу ўвайшоў ён туды, чуць не аслеп ад бляску, і сустракае там матку сонейка. Тая і пытае, чего ён прыйшоў.

—Прыйшоў, — ён кажа, — сонейка, каб запытаць: чаму так робіцца ў свеце?

А тая адказвае, што сонейка паднялося на небе аглядаць адтуль зямлю.

Пачакай, яно хутка вернецца.

Наклаў ён сабе агеньчыку, сядзіць, грэецца ды смажыць сала на ражончыку. Наеўся сала з хлебам. Захацелася яму піць, Пайшоў ён к рацэ, каб напіцца, Толькі ён схіліўся к вадзе — аж адтуль выплыла вельмі гожая паненка ды зірнула на яго, дык ён стаў, бы ўкопаны. Стаіць, пазірае і вачэй не можа адарваць ад яе. Спадабаўся ён той паненцы, яна і кажа яму:

—Не пі вады з ракі, бо тады сонейка цябе спаліць.

Дый павяла яго пад стары дуб, дзе была крыніца. Схіліўся ён ды і пачаў піць тую чыстую, халодную ваду. Колькі ён ні п'е, усё больш хочацца, і не можа ніяк напіцца.

—Годзе табе піць, — кажа паненка, — бо ўсё добра ў меру. Ты хочаш усё знаць, чаму так, а не інакш, а не ведаеш таго, што хутчэй выпіць усю ваду, чым усё знаць. Ты трохі напіўся, то і будзеш жыў, трохі свету пабачыў, то і будзеш знаць пра патрэбу.

Зірнуў ён — аж сонейка апускаецца з неба ў свае палацы. Трэба ісці туды, але не можа ён адарваць вачэй ад тое паненкі. А яна і кажа:

— Вось мой бацька вярнуўся да гасподы. Глядзі, нічога не кажы яму, што ты пазнаў і што мяне бачыў.

Тут яна ўзнялася ў гору ды заблішчэла адтуль гожаю зоркаю. Пайшоў ён да сонейка ў палацы. Убачыла яно, што чалавек асмеліўся прыйсці, ды як пачне смаліць яго ды пячы, дык аж мур кругом трашчыць, а ён як напіўся халоднае вады, дык і ні панкі. Раз-

злавалася сонейка, давай яшчэ горш пячы, а ён шапку насунуў на вочы дый падыходзіць бліжэй. Бачыць яно, што нічога не парадзіць з упартым чалавекам, вось і пытае яго, што яму трэба. Расказаў ён сонейку, чаго прыйшоў, а тое і кажа:

— Як будзеш усё знаць, то хутка памрэш, — і бліснула сонейка яму ў галаву.

От і пачуў ён, што многа знае, але галава гарыць, а ў сэрцы холадна, бы лёд. Выйшаў ён ад сонейка дый сустракае матку сонейка. Тая і кажа:

— Памрэш ты, чалавеча, калі не сагрэеш сэрца, бо без сэрца галава згарыць.

Дагадаўся ён, як нагрэць сэрца, пайшоў шукаць тую паненку, ды зваць яе з неба. Пачула яна, хутка пакацілася з неба яснага зоркаю і стала каля яго тою гожаю паненкаю. І загарэлася ў яго ў сэрцы, і пачуў ён, што пакуль будзе там гарэць, датуль ён будзе знаць, чаму ўсё так робіцца на свеце. Пабраліся яны ды пайшлі ў яго край. Падыходзяць яны к таму месцу, дзе чалавек перагрaбае смецце.

—Ой, чалавеча, — кажа ён, — ты ў смецці шукаеш згубленыя грошы ды дарма траціш час. Ідзі ты працуй, то хутчэй заробіш больш тых грошай.

Зразумеў той чалавек сваю памылку ды пайшоў гараваць, працаваць — і нажыў гаспадарку і грошай на патрэбу. Ідуць яны далей, аж тыя жанкі ўсё пераліваюць ваду. І растлумачыў ён ім, што колькі б яны не пералівалі, то вада вадою будзе, як колькі б яны ні гаварылі, то нічога не выгавараць. Ідуць далей, аж чалавек падпірае тын. Ен і кажа:

—Не падпірай у жыцці гнілое, бо яно ўсё роўна ўпадзе.

Нарэшце падышлі яны к таму чалавеку, што ўсё сядзіць на камені, ды пайшлі міма яго. Адышліся трохі, ён і кажа здалёк:

— Патуль ты сядзіш, пакуль другі тут сядзе, бо ў жыцці кожны займае сваё месца.

Прыйшлі яны ў яго край, знайшлі тую вёску, дзе ён жыў, але там ужо без гаспадара і хатка яго абярнулася, ды яе хлопцы расцяглі на агонь. Няма чаго рабіць, трэба жыць, як набяжыць. І пачаў ён будаваць сабе харомы ды заводзіць гаспадарку. Па немалым часе абрабіліся яны дый пачалі жыць ды пажываць, ды дабра нажываць. І дзівіліся людзі, што яны жывуць і ніколі не тужаць. Пачалі яго пытаць, чаму яны так добра жывуць, а ён і кажа:

— Затым мы добра жывём, што ў нас агонь у сэрцы, а розум у галаве.

## ГУСЛІ

Жыў колісь круглы сірата Іваньчык. Яшчэ маленькі астаўся ён без бацькі і без маці. Узяла яго к сабе хрышчоная маці, падгадавала трохі дый аддала ў людзі, пасці гусей. Пасе ён гусі ды разглядвае божы свет, а кругом так гожа, так радасна. Яснае сонейка свеціць і хукае, бы на дзіцятка родная матка. Ветрам ціхенька калыша зялёнае вецце на вербах. Рака блішчыць праз рэдкія кусты алешніку, бы тое люстэрка, што дзядзька купіў сваёй дачцэ Ганне; а ў затоне адбіваюцца тоўстыя, старыя дубы, курэнь дзеда Ахрэма каля неравоза, стог леташняга сена з плотам кругом і нават каровы суседняй вёскі, што пасуцца на беразе. Толькі ўсё гэта дагары нагамі.

Задумаўся пастушок Іваньчык, чаму гэта ў вадзе адбіваецца ўсё дагары нагамі, задумаўся, але не надоўга, бо ў той самы момант гусак выцягнуў шыю, крыкнуў і парасцярог гусей, што вораг блізка. Зірнуў Іваньчык на неба, аж там хутка плыве вялізазны шуляк ды пазірае на яго гусяняты.

Закрычаў Іваньчык і памахаў хварасцінкаю. Схаваўся шуляк за высокім лесам, а Іваньчык усё стаіць ды пазірае на неба, ды так пазірае, што й забыўся рот закрыць. І захацелася яму лятаць па небу, як той шуляк, замахаў ён рукамі, дый пабег па зялёнай траве, па кветках, што гожа раслі на поплаве. Доўга бегаў Іваньчык, растапырыўшы рукі, бегаў, кружыўся, бы птушкі ў небе, нарэшце ўтаміўся, і лёг на траву дагары вачамі і ўсё глядзеў на неба, як там цудоўна, гожа, ціхенька плылі лёгкія белыя хмаркі, бы гусіны пух, як яны сустракаліся з ясным сонейкам, цалавалі яго і плылі далей.

Разглядаў Іваньчык, як гожа і прамудра зроблен белы свет. Сэрца яго радасна білася ў грудзях, вочкі блішчалі, бы два дыяменты, яму было так лёгка, так весела тут, на поплаве, на зялёнай траўцы, пасярод свежых, рознага колеру кветак, што ён нават забыў той час, калі трэба было ісці дадому абедаць, бо гаспадыня была сярдзітая жанчына, вяла свой парадак і не любіла, калі хто пазніўся на абед, Усхапіўся ён, зірнуў на сонейка, аж яно ўжо схіляецца к захаду.

— Паабедалі ўжо, — думае пастушок і гуляе да вечара не еўшы.

Так той Іваньчык перш пасціў гусі, потым памагаў аўчару, а нарэшце, як вырас, пачаў пасці гаўяда. Тут ён навучыўся размаўляць з кароўкамі, разумеў мову ўсялякае жывёлы і нават расліны. Яму здавалася, што птушкі пяюць яго песні, што мушкі ды полуднічкі жаласна гудуць, дак гэта яны плачуць над яго горкаю, пастуховаю доляю, што гаўяда пазірае на яго і хоча сказаць: «Бедны пастух! Ніколі не

быць табе гаспадаром... Кінь гэты край ды ідзі ў свет шукаць шчасця».

Яму здавалася, што лес ківае яму веццем, што траўка і кветкі яму шэпчуць ціхенька: «ідзі ў свет».

Паслухаў іх наш Іваньчык і пайшоў у свет шукаць шчасця. Хадзіў, хадзіў, але куды ні прыйдзе, усюды горш як там, дзе быў уперад. Кіне ён тое месца ды ідзе далей. Дахадзіўся нарэшце да таго, што і свет не міл. От падышоў ён к рацэ дый хацеў утапіцца. Толькі ён ступіў на ваду, аж тая зрабілася цвёрдая бы лёд. І пайшоў наш іваньчык па вадзе, бы пасуху. Сустракае яго якісь панічык дый кажа:

— Найміся ка мне на службу.

— А чаму ж не, — адказвае наш Іваньчык, — якому чорту не служыць — усё роўна,

—А адкуль ты знаеш, што я чорт?

—Спявай песню павам, а чорт бачан па халявам.

—Бачу, што з цябе будзе добры слуга, — кажа чорт, — я ж табе заплачу за тое харошыя грошы.

—Дзе грошы, там і вошы, — адказвае наш Іваньчык.

—А чаго ж ты хочаш?

—Ты таго не маеш, хоць мяме служыць наймаеш. Ды што там таргавацца, лепш хутчэй за дзела брацца. Буду служыць хоць у пекле, абы было пекне.

Згадзіліся яны на тым. Зняў чорт свой капялюшык і махнуў ім тройчы. Тады наш Іваньчык сапраўды ўбачыў у чорта рогі і паабапал плеч чорныя крылы, бы ў кажана. Зняў і наш Іваньчык сваю рваную кучомку, памахаў ёю тройчы, і выраслі ў яго крылы, бы ў шулянка. От узняліся яны і паляцелі, ды толькі не ўгору, не к яснаму сонейку, а чорт ведае куды, паляцелі ў якуюсь пропасць усё ўніз і ўніз.

Доўга ляцелі яны, агарнула іх кругом цемень, хоць ты вока выкалі. Але вось па немалым часе спераду штось заблішчала. Хутка яно разраслося, бы сухім летам у лесе пажар. Падлятаюць яны бліжэй, аж там стаяць вялізазныя катлы, а ў іх гарыць смала. Полымя шыбае, а смала кіпіць, аж булбаткі падскакваюць.

Дагадаўся наш Іваньчык, што гэта пекла. Але няма чаго рабіць, калі наняўся, то як запрадаўся, трэба служыць. Азірнуўся ён, а тут як шыбанула полымя, дык яго крылы і згарэлі. Астаўся там Іваньчык. І вялеў яму чорт доўгаю жалезнаю качаргою ў катлах смалу памешваць

Павярнуў ён качаргою, аж там у смале мучацца грэшныя душы. Варочае ён качаргою ды разглядвае тыя грэшныя душы. Каго там толькі не было. Перш-наперш вынырнула лысая галава ксяндза, а поруч з ёю кіпелі ў смале доўгія кудлы папа. Павярнуў ён качаргою,

дык разам выскачылі са смалы маладзенькая паненка, абняўшыся са старым панам, старая пані, хурман з бізуном, лёкай з пляшкаю ў горле, камісар з ксёнжкаю пад пахаю, пакаёўка, кухар, аканом, цівун і многа іншых дваровых людзей. Павярнуў ён яшчэ раз качаргою, дак тут ужо былі: сам ландар з жонкаю, рабін з бібліяй, цодык з тораю, маламед з ксёнжкаю, каваль, шавец, кравец, крамар і крамарка, шапар, нават анучнік і той высунуў са смалы сваю галаву. Пайшоў Іваньчык да другога катла, павярнуў у ім качаргою, дык тут паказаліся нашы браты хрысціяне і ўсё больш самыя набожныя, людзі ды такія, якіх лічылі пры жыцці чуць не святымі.

Хацеў ён ісці далей; ды зірк, аж тут яго хросная маці. Убачыла яна яго дый кажа:

—Ой, мой сыночак, пакінула я цябе маленькага, дык за тое тут мучуся.

—Несправядлівы суд, мая матачка, — адмовіў ёй Іваньчык. —- несправядлівы затым, што я толькі тады і быў шчаслівы, як ты мяне аддала пасвіць гусі.

Толькі ён гэта прамовіў, як яго хросная матка выйшла з катла ўся ў белым убранні, бы снег, і стала поруч з ім.

— Дзякуй табе, мой сыночак, — кажа яна, што аслабаніў мяне ад гэтае мукі. Уцякай ты адсюль, бо чэрці яшчэ жыўцом укінуць цябе ў смалу. Я памагу табе, як адсюль выбрацца.

От і павяла яна свайго сынка з пекла вон. Доўга яны ішлі паміж катлоў з гарачаю смалою, якое мукі яны там не бачылі, якіх енкаў не наслухаліся, нарэшце падышлі к краю пекла. Хросная маці разам і знікла, а наш іваньчык пакруціў тройчы сваёй кучомкаю, дык і выраслі ў яго крылы.

От узняўся ён і паляцеў усё ў гору ды ўгору. Ляціць аж вецер свішча, хмаркі мінаюць, толькі мігаюць. Даляцеў ён да зямлі, вельмі ўтаміўся дый лёг спачыць. Але вось прыйшоў стары, а можа, гэта яму прыснілася, і даў яму гуслі.

—На, кажа, — у гэтых гуслях усё тваё шчасце.

Ды знік. Устаў Іваньчык, узяў тыя гуслі і зноў пайшоў у свет. Нядоўга ён хадзіў і наняўся пасціць каровы. От выганіць ён каровы на пашу, сядзе сабе на купіну, ды як пачне іграць на гуслях, дык і пусцяцца ўсё скакаць. Скачуць каровы ўвесь дзень, а малако з цыцак цыр-цыр і выліваецца. Прыгоніць ён каровы дамоў, пачнуць іх даіць, а малака няма. Дзівуецца гаспадар, якое б гэта ліха зрабілася, ды нічога не прыдумае. Пайшоў ён к рабіну на нараду, расказаў сваю бяду. Той чытаў, чытаў біблію дый кажа:

—Гэта яляк ссе твае каровы.

І раіць рабін яму ўзяць ад усіх кароў таго, што дарам выліваецца, наліць у гаршчок, у пятніцу зварыць, а ў шабас ужываць разам з гуселем, а што астанецца, дык тым вышмараваць у кароў вымя.

Падзякаваў той рабіну, зрабіў рыхтык так, як ён радзіў, але нічога не памагае. Каровы не то, што не даюць малака, але і самі пачалі худзець, пятрэць от бы на іх якая хвароба прыйшла. Ходзіць гаспадар бы шалёны, не ведае, што рабіць, што парадзіць. Сустракае яго адзін п'янчужка, што называўся кавалём, а тым часам заўжды сядзеў у карчме. Той і радзіць яму знайсці такога знахара, каб ён пазнаў, хто гэта прырабіў, што каровы не даюць малака.

—А хто ж будзе лепшы знахар ад цябе?

А гэты п'янчужка сапраўды знахараваў.

Даў гаспадар яму кварту гарэлкі, от ён выпіў і пацёгся на пашу цікаваць, як гэта наш Іваньчык пасе каровы. Падыходзіць ён, аж пастух іграе на гуслях, а каровы скачуць, аж з іх пена валіць. Дагадаўся той п'янчужка, чаму каровы не даюць малака, павярнуў, каб ісці да карчмы, толькі вось яму так захацелася скакаць, што от ногі самі і ходзяць. Але, ведама, якія скокі п'янага.Ласкакаў ён, пакуль іграў Іваньчык, дый сунуўся ў канаву. На другі дзень прыйшоў ён к гаспадару і кажа:

— Ну, ведаю, хто гэта ўдзеяў. Давай гарэлку, то скажу.

Даў яму дзве кварты гарэлкі да асяленец на закуску. Той п'янчужка і кажа, што ва ўсім вінаваты пастух. Не мае гаспадар веры.

— Ну, дык спраканайся сам, — кажа п'янчужка, — схадзі на пашу ды паглядзі, як твае каровы пасуцца.

Схадзіў гаспадар ды як пачуў тую ігру, дык сам пусціўся скакаць. Скакаў той пяхцяр разам са сваімі каровамі датуль, пакуль Іваньчык здаволіўся і палажыў тыя гуслі.

Няма чаго рабіць, заскаржыў той пяхцяр на Іваньчыка ў суд. Разабраў суд справу ды за такое вядзьмярства прысудзіў Іваньчыка павесіць.

От схапілі яго і вядуць на шыбеніцу. Ідзе ён і трымае гуслі пад пахаю. А тут сабралася людзей, як на кірмашы, каб паглядзець, як будуць вешаць ведзьмара. Бабы галосяць, дзецюкі шуткуюць, а іншыя кажуць, што калі гэта вядзьмар, то яго не павесяць. От ужо кат падвёў Іваньчыка к шыбеніцы і хацеў накласці яму на шыю вяроўку, але той выняў з-пад пахі гуслі і як зайграе, дык усе пусціліся скакаць, як гарох на гарачай скавародзе. Скача кат, абняўшы шыбеніцу, скача суддзя з паперамі ў руках, скача поп з крыжам перад носам, скачуць мужыкі і бабы, аж пот з іх валіць, скача ўсё ллеста, бы мошкі мак

таўкуць. Іграў, іграў Іваньчык ды ўсё далей адыходзіў ад шыбеніцы, нарэшце зусім знік.

Схамянуліся ўсе, разінулі рот ды стаяць, як дурні, а нашага Іваньчыка і след прастыў. Пачалі яго шукаць, каб злавіць, але ж кажуць, што нялёгка злавіць вецер у полі, ды яшчэ горш злавіць таго музыку, каторы прымушае ўсіх скакаць.

## ІВАНКА-ПРАСТАЧОК

У якім-та краю жылі людзі, бы ў раю: гаравалі, працавалі і ды бяды не мелі. Свет вялікі, зямлі многа, усюды вольна, працуй на хлеб, рабі ды бога хвалі. І жылі там людзі ў ласцы, у згодзе ўвесь дзянёчак працавалі, а аб ночы аддыхалі. А прыдзе бяда, — у згодзе ратаваліся ў прыгодзе: бедным, хворым памагалі, дык і ўсе бяды не мелі.

Толькі вось адкуль узяўся і пачаў сюды лятаць страшны Змей; пачаў лятаць, пачаў дабро цягаць, а нарэшце і людзей хватаць ды к сабе цягаць. Нахватаў ён людзей і давай будаваць сабе харомы. Нахватае адусюль людзей, загоніць іх у адно месца ды і прымушае будаваць харомы, акопваць іх канавамі, абсыпаць валамі ды абгароджваць частаколам, каб ніхто не мог туды ўлезці.

Будуюць людзі, капаюць канавы, насыпаюць валы зямлі, бы горы, і патуль гаруюць, пакуль там не згінуць.

А Змей хватае і валочыць туды ўсё новых і новых людзей. Вось набудаваў ён многа такіх агародаў, пралажыў паміж імі шляхі, лятае па іх ды цягне ў агароды і людзей і людское дабро.

Працуюць людзі, загаруюць што кольвек, а тут наляціць Змей, абярэ ўсё, бы пажар, а людзі пухнуць ад голаду ды мруць, бы мухі. І чым далей, тым горай: няма спосабу, няма ратунку ад ліхога Змея. Тым часам тыя людзі, што іх Змей навалачыў у свае харомы, жаруць сабе людское дабро, нічога не ро.бяць ды толькі сала гадуюць. Дык вось не толькі Змей, але і яны, забыўшыся бацькоў ды братоў, пачалі па шляхах вылазіць з агародаў, бы мурашкі з муравейніка, пачалі хадзіць па свету ды адбіраць у людзей іх дабро.

І стала людзям горай ад тых людзей, як ад Змея, бо, ведама, гэтых ліхіх слуг Змея вельмі многа. Яны, бы плойма, усюды находзяць людзей і адбіраюць у іх, што ўбачаць. Няма ў іх літасці — з жывога скуру дзяруць. І пачалі яны лічыць людзей горай гаўяда, пачалі саромецца, што самі яны людзі, пачалі выдумляць сабе розныя назвы. Хто назваў сябе змеем, хто ваўком або мядзведзем, ці другім зверам, хто арлом, коршунам ці другою птушкаю, хто якім кольвек дзеравам.

Толькі людзей яны называюць проста людзьмі, быццам гэта самае горшае імя. Дык от скуль узяліся паны Свінскія, Ваўкі і іншыя.

Але вось радзіўся ў тым краю хлапчук. Быў ён вельмі благенькі, вельмі худы: як заняпаў з маленства, дык так і астаўся на ўсё жыццё.

Ні паны, ніхто яго не чапае, бо ён такі нехлямяжны, што нікому не патрэбны. От ён і вырас ужо, але ўсё гуляе з дзецьмі, бы маленькі, і празвалі яго людзі Іванкам-прастачком,

Узімку сядзіць сабе Іванка-прастачок на печы ды з лучыначак цацкі складвае, а ўлетку пясочак перасыпае з дзецьмі. Так пражыў ён гадоў трыццаць.

Вось раз сядзіць Іванка-прастачок на зямлі каля прызбы ды перасыпае пясочак, аж ідуць тры старцы, Гірыйшлі яны к хаце ды і селі на прызбе аддыхаць, У сяле ні жывой душы — пан усіх выгнаў на работу. Пуста, хоць падпалі, Сядзяць старцы на прызбе, аддыхаюць ды насыпаюць у люлькі тытуню, Хапіліся яны — аж няма агню, ды і просяць Іванка, каб ён дастаў агню люлькі закурыць. Пабег Іванка ў хату, набраў у прыгаршні жару ды і прыносіць старцам. Закурылі тыя люлькі, падзякавалі Іванку ды і пытаюць яго, што ён робіць.

— Пясочак перасыпаю, — кажа Іванка, — бо што ні рабі, то ўсё на паноў. А нашы людзі дурныя, цягнуць жылы ды са ўсёй сілы гнуцца, дзела спраўляюць, а ліха маюць, бо паны ўсё к сабе грабуць, з мужыкоў скуры дзяруць, а то і зусім іх к сабе бяруць, за свет заганяюць, б'юць, калечаць, мучаюць, забіваюць і літасці не маюць.

Паслухалі тое старцы, галавамі паківалі, узяліся за струманты ды і зайгралі. Першы раз зайгралі — Іванку розум далі; другі раз зайгралі — у сэрца жаласць нагналі; трэці раз зайгралі — язык Іванку развязалі.

Зніклі старцы, а Іванка-прастачок стаў ужо не дурачок, стаў за дзела брацца ды ў свет збірацца. Зрабіў дудку-весялушку дый заграў сабе так жаласліва ды так гожа, што не толькі людзі, а звяры і птушкі сталі яго слухаць, сталі ўкруг збірацца. І пачаў Іванка-прастачок па свеце хадзіць, у дудачку граць, людзей збіраць ды ім праўду казаць. Як зайграе, дык і ўбачаць людзі, што вялікая крыўда на свеце, што адны пануюць, другія гаруюць; адны багаццю лічбы не маюць, другія з голаду паміраюць. І разнёсся ад Іванкавай дудкі голас па ўсяму свету. Пачалі людзі к таму голасу прыслухоўвацца ды розуму набірацца; пачалі думаць ды гадаць, як за праўду пастаяць.

От учулі па палацах той вялікі голас ды і спалохаліся слугі Змея, пачалі яны войска збіраць ды Іванка-прастачка шукаць. Чуюць голас на ўсходзе — шамялях яны туды. Палашы блішчаць, пікі, бы лес, тырчаць, гарматы грымяць, а Іванкі не відаць. Стануць ціха, бы на

паляванні, слухаюць, стаяць. Аж тым часам чуюць голас на захадзе — грае дудка-весялушка, грае, людзей навучае. !дзе пошчак ад сяла да сяла, па полі, па лесе, ад краю да краю. Кінуцца яны на захад, гоняць коней, бягуць самі, шаблямі зві- няць, ды Іванка не спаймаюць. Гудзе дудка, грае: то засвішча, то, бы бусел, заляскоча, то зацягне тонка-тонка, от бы павуціна, то так дробненька шчабеча, што ў паноў аж лыткі затрасуцца, а мароз бяжыць па спіне, быццам мышы туды залезлі ды і скрыбуцца пазурамі.

З тых часоў слугам Змея ні ўдзень ні ўночы няма спакою, бо бяды яны сабе чакаюць, бы вол доўбні. Дудка свішча, дудка грае, пошчак па свету гуляе, людзей навучае. Яго ні злавіць, ні з гарматы не забіць. Ён вольна па свету гуляе, ні якіх загародак не знае; хоць сам без цела, ды вялікую сілу мае. Грае-грае, а як прыйдзе час, дык усіх ён параўнае.

Ой, ты дудка мая, весялушка мая!

## ЯК САЛДАТ ВЯРТАЎСЯ ДАДОМУ

Праслужыў салдат дваццаць пяць год у цара, а заслужыць нічога не заслужыў. Ідзе салдат дадому і думает «Як далей быць? Хто дома астаўся, хто маю старасць дагледзіць?». Раптам сустракаецца яму хораша адзеты, у капелюшы чалавек.

— Здароў салдат, — гаворыць падарожны. — Дзе быў і куды ідзеш?

— Ды вось, — кажа салдат, — праслужыў дваццаць пяць год цару. Іду дамоў, а як буду жыць — не ведаю.

Чалавек гаворыць яму:

— Праслужыў дваццаць пяць год цару, паслужы яшчэ мне гадок, я цябе забяспечу на старасць.

Салдат падумаў:

—Ну што ж, давай паслужу.

І пайшлі разам з гэтым чалавекам. Ішлі праз лес, балоты, і ўбачыў салдат дварэц. Гэты чалавек і гаворыць:

—Вось тут будзеш працаваць,

—А што ж я тут буду рабіць? — пытаецца салдат.

Чалавек прыводзіць яго ў кут, дзе стаіць вялізны кацёл.

—Вось, — кажа, — будзеш у гэтым катле ваду грэць. Вось і дровы. І незнаемы чалавек раптам знік.

Салдат падклаў пад кацёл дровы, запаліў і пайшоў паглядзець, дзе тут што яшчэ ёсць. Заходзіць салдат у адзін пакой — там стаяць

сталы, крэслы, а на сталах стаіць піць і есці — усё, што толькі душа жадае. Салдат напіўся, наеўся, пайшоў у другі пакой.

Заходзіць — там стаяць ложкі, пярыны, пуховыя падушкі, коўдры. Лёг салдат паспаць. Прачнуўся, абышоў увесь дом — нідзе нікога не знайшоў. Жыве так дзень, другі, трэці, і такі напаў на яго смутак, што немаведама за што ўзяцца, з кім павесяліцца. Пайшоў зноў салдат шукаць, ці не знойдзе якую ккіжку ці газету, каб хоць пачытаць што-небудзь. У адкым кутку ўбачыў раскіданую па лістках кнігу. Пачаў салдат гэтуга кнігу па адным лістку складаць, склаў, пачаў чытаць. От чытае салдат і чуе голас:

— Салдат, салдат, выратуй мяне!

Салдат кінуў чытаць і пайшоў шукаць таго, хто яго клікаў. Абышоў усе пакоі, усе куткі — нікога не знайшоў. Прыходзіць, садзіцца, зноў чытае, чуе зноў голас:

— Салдат, салдат, выратуй мяне!

Салдат зазлаваў ды кажа:

—Чорт цябе ведае, дзе ты ёсць, і як цябе ратаваць?

Тады голас кажа:

— Я ў катле.

Прыходзіць салдат да катла і думае: «Ну, як жа яго дастаць?». Кацёл глыбокі, метры тры. Салдат зняў з сябе рубашку, парваў на стужкі, звіў вяровачку, прывязаў да канца каменьчык і давай апускаць у кацёл. Чуе — нешта ўчапілася. Давай салдат цягнуць угару. Калі выцягнуў — дык гэта была такая прыгожая дзяўчына, што ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць.

— Ну, — кажа, — дзякуй, салдат! Дапамог ты мне, дапамагу і я табе ў тваёй бядзе. Гэта — дварэц чараўніка. І ты ўжо ў яго праслужыў дзесяць год. Скора чараўнік прыдзе табе плаціць, але ты ў яго нічога не бяры — ні золата, ні паперак, а прасі ў яго, каб ён табе даў той рваны кашалёк, што ляжыць у той самай каморцы, дзе была растрапаная кніга. А я дачка цара, — і сама знікла.

Раптам адкуль узяўся чараўнік і кажа:

—Ну, салдат, адслужыў ты ў мяне сваё. Можаш ісці дадому. Вось хадзем, я табе дам за тваю службу. Чым хочаш бяры: хочаш золатам, хочаш паперкамі. І бяры, колькі ты можаш панесці.

Салдат успомніў словы, што казала яму царская дачка.

—Не,. — кажа салдат, — не хачу ні вашага золата, ні паперак. А дайце мне рваны кашалёк, што ляжыць у тым кутку.

Чараўнік раззлаваўся:

— Прэч, — кажа, — пайшоў адсюль, нічога не дам!

Салдат выскачыў з дому і думае: куды ж ісці? Сюды ішоў па нейкіх балотах, па лясах, а то проста з дварца ідзе дарога і недалёка відаць якісьці горад. Ну, думае, пабягу проста,

Бяжыць салдат, маркоціцца: «Каб яго ліха! І тут нічога не заслужыў». Прыбягае на скрыжаванне дарог, і адкуль ні вазьміся бах пад ногі той рваны кашалёк, што ён бачыў у чараўніка. Падняў салдат кашалёк і думае: «Вось дык парадзіла яна мне, што ўзяць! Гэта ж кашалёк варты ўсяго тры грошы. А я мог бы ўзяць пудоў два-тры золата! Ну, пагляджу, што ў тым кашальку ёсць!».

Адкрыў салдат кашалёк — у кашальку нічога няма, а пад нагамі нешта зазвінела. Глядзіць, а ля ног кучка золата. Салдат думае: «Адкуль золата?». Адкрыў зноў кашалёк — і зноў насыпалася кучка золата. Узяў гэты кашалёк салдат, пабег у горад. Калі гляне — у горадзе на кожным рагу вуліцы вісіць аб'ява, што такіта салдат украў у пана Сцяпана кашалёк. А ліхачка! Пабег ён у краму, купіў сабе паліто, касцюм, шляпу, скінуў усё салдацкае.

Салдат думае: «Куды ж тут дзецца, каб не злавілі?». От рашыў ісці да вартаўніка ў царскі сад. Адзеў зноў усё салдацкае, зайшоў да вартаўніка і просіцца пераначаваць. Вартаўнік не пускае, бо няма дзе пераначаваць, а потым сказаў яму начаваць у будцы ў садзе:

—Вось у нашым садзе, — гаворыць вартаўнік, — ёсць дуб у тры абхваты таўшчынёй. І наш цар дае вялікую ўзнагароду таму, хто гэты дуб зрэжа і на месцы яго паставіць помнік. Але ніхто не знаходзіцца.

Салдат падумаў ды кажа:

— Далажы цару, што з'явіўся салдат, які можа гэта зрабіць.

На другі дзень вартаўнік далажыў цару, і цар распарадзіўся рэзаць дуб і рабіць помнік. Праз некалькі дзён помнік быў гатовы, Зноў салдат і вартаўнік леглі адпачыць у будцы ў садзе. Не паспелі яны заснуць, як чуюць голас:

— Хто мяне пахаваў — выходзь!

Салдат кажа на вартаўніка:

— Ты выходзь, ты гаспадар у садзе.

— Не, я не пайду, ты пахаваў, ты і выходзь.

Салдат тады кажа:

— Што будзе, то будзе, а выходзіць трэба.

Выходзіць салдат і бачыць — каля помніка стаіць чалавек.

— Ты мяне пахаваў? — пытаецца чалавек у салдата.

Салдат гаворыць:

— Я толькі зрэзаў дуб і паставіў помнік, а нікога не хаваў.

— Вось гэты дуб, — кажа чалавек, — гэта і быў я. А цяпер пойдзем за мной, і я перадам табе ўсё мае багацце.

І павёў чалавек салдата па балотах, па лясах. Прыходзяць да муру высачэзнага. Чалавек дзьмухнуў на гэту сцяну — і сцяна разышлася. За сцяной відаць дварэц, увесь ззяе. Чалавек і кажа:

— Вось гэта мой дварэц, я табе яго перадам. А цяпер стукніся аб зямлю.

Салдат стукнуўся — стаў замест старого малады, прыгожы, моцны, А той чалавек знік. Салдат жа рашыў пайсці ў царскі сад да вартаўніка. Падышоў да саду, стукнуўся аб зямлю і зноў ператварыўся ў таго ж самага старога салдата. Пытаецца ў вартаўніка, што ў іх новага чуваць? Вартаўнік расказвае, што недалёка ад горада ёсць возера, у гэтым возеры водзіцца змей. І з кожнага дома вадзілі гэтаму змею на з'ядзенне людзей, а цяпер чарга дайшла да самога цара. Заўтра павядуць на бераг ягоную дачку.

Салдат, нядоўга думаючы, паімчаўся ў свой дварэц, ударыўся аб зямлю, ператварыўся ў моцнага чалавека, схапіў меч, сеў на каня і паехаў на бераг возера. Прыехаў і схаваўся ў кусце на беразе.

Раніцай прыбралі царскую дачку на смерць і прывялі на бераг, Адзін з царскіх генералаў астаўся сачыць, што будзе з царскай дачкою. Убачыў салдат царскую дачку і пазнаў, што гэта тая самая, што была ў доме чараўніка.

У гэты час запенілася вада ў возеры, зашумеў вецер і з возера вылазіць дзевяцігаловы змей. Салдат выскачыў з куста, махнуў мячом, шэсць галоў адсек, а тры асталіся. І адна галава ўхапіла салдата за руку. Салдат выхапіў руку і адсек апошнія тры галавы, а тулава змея спіхнуў у возера. Рука ж яго ўся залілася крывёю. Царская дачка адарвала стужку ад свае сукенкі і завязала руку салдата. Яна просіць яго да сябе ў госці, бо цар будзе рабіць пір з радасці.

Пайшла царская дачка дадому. Сустракае яе генерал і кажа, каб яна прысягнула, што ён яе выратаваў, а калі не прысягне, то ён яе застрэліць, Што рабіць — згадзілася.

А салдат адвёў каня і прыйшоў зноў у царскі сад да вартаўніка. Вартаўнік гаворыць, што заўтра ў цара будзе пір на ўвесь мір і на пір цар запрашае ўсіх — і бедных і багатых.

Салдат кажа:

— Ну што ж, пойдзем, паглядзім,

Назаўтра пайшлі яны на пір. А там стаіць сталоў — канца не відаць. А на сталах і піць, і есці, і курыць, і музыка іграе. Уладзіліся салдат з вартаўніком на самым апошнім стале. У гэты час царская дочка, узяўшыся падручкі з генералам, абыходзілі ўсе сталы. Падышлі яны пад апошні стол, бачыць царэўна ў салдата на руцэ стужку са сваёй сукенкі. Прыглядзелася яна і пазнала, штэ гэта той салдат, які

выратаваў яе з катла. Як кінулася яна да салдата, а генерал давай яе не пускаць. Тады яна вярнулася да цара і расказала, што выратаваў яе ад змея не генерал, а салдат, які сядзіць ля самага апошняга стала. Цар загадаў генерала арыштаваць, а салдата даставіць да яго.

Прыйшоў салдат да цара, паказаў змяёвыя галовы і стужку царэўны. Расказаў, як выратаваў дачку цара з катла чараўніка і ад змея абараніў.

Цар загадаў генерала расстраляць, а царэўну ажаніў з салдатам.

На гэтым вяселлі я быў, мёд-віно піў, па барадзе капала, а ў рот не папала. На гэтым казка ўся.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

З ПАЛЕСКІХ КРЫНІЦ (Беларускія казкі)

Складалкнік Л. Г. Філатаў

ISBN 5-87820-004-X

Рэдактар У. І. Захарэвіч
Тэхнічны рэдактар Д. І. Пышнік
Мастацкі рэдактар Б. І. Ількіў
Карэктар Т. В. Качалоўская
Малое дзяржаўнае прадпрыемства па выдавецтву, выпуску і збыту друкарскай прадукцыі «Брэстдрук»,
224653, г. Брэст, вул. Маскоўская, 75/1.